**ДА ПЫТАННЯ АБ ПАНЯЦЦІ «ЯЎРЭЙСКАЕ МАСТАЦТВА». ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ АГЛЯД**

***Гефцер Л.М.,***
*аспірант ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – **Ізафатава К.В.,** канд. мастацтвазнаўства*

Ключавыя словы. Яўрэйскае мастацтва, даследчыкі, асноўныя крыніцы, праблематыка, артыкул, палеміка, розныя ракурсы.

Key words. Jewish art, researches, main sources, problems, article, controvercy, different angles.

Многія даследчыкі вывучаюць яўрэйскае мастацтва, яго нацыянальную спецыфіку, выяўляюць асаблівасці фарміравання, развіцця, а таксама існавання ў нашы дні. Гэта тэма з'яўляецца прадметам спрэчак і ў ёй сутыкаюцца аргументы, якія нярэдка адносяцца да розных ракурсаў. Сярод аргументаў на карысць таго, што яўрэйскага мастацтва няма, найбольш часта ўзгадваецца факт адсутнасці аднастайнага стылю, які б выяўляў пэўную паслядоўнасць на працягу стагоддзяў і ідэнтычнасць. Аднак калі мы звернемся да гісторыі, то ўбачым, што яўрэйскі народ, у сілу пэўных перадумоў і абставін, часта перамяшчаўся. Яўрэйскія мастакі здольныя тлумачыць і інтэрпрэтаваць мастацтва ў асаблівай манеры, а тэрытарыяльная разрозненасць дала глебу для спалучэння розных стыляў з апорай на ўласную традыцыю.

Мэта – гістарыяграфічны агляд шэрага асноўных крыніц па тэме яўрэйскага мастацтва, абазначэнне найбуйнейшых даследчыкаў, якія звярталіся да дадзенай праблематыкі.

**Матэрыял і метады.** Матэрыяламі для артыкула паслужылі працы навукоўцаў, дзе прасочваецца адпаведная тэма, абагульняюцца агульнавядомыя дадзеныя і вылучаюцца гіпотэзы. У аснову артыкула пакладзены апісальна-аналітычны метад даследавання.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Валерый Дымшыц у артыкуле «Разважанне аб яўрэйскім мастацтве» піша пра тое, што існуе два падыходы да вызначэння тэрміна «традыцыйнае яўрэйскае мастацтва» [1]. У адпаведнасці з першым падыходам, любы твор, выкананы па замове яўрэйскай абшчыны або яўрэйскай сям'і, можна класіфікаваць як твор яўрэйскага мастацтва і пры гэтым паходжанне майстра не мае значэння. Другі падыход мае на ўвазе, што да яўрэйскага мастацтва адносяцца творы, якія выкананы ў нацыянальным стылі. Далей аўтарам зроблена выснова аб тым, што калі абапірацца на другі падыход, то прыналежнасць пэўнага прадмета да мастацкай традыцыі яўрэяў павінна выражацца спецыфічнай стылістыкай дэкору і формы, а не яго культавай функцыяй. Разам з тым, адзінага яўрэйскага мастацтва і стылю не існуе. В. Дымшыц піша: «Яўрэйская дыяспара была і застаецца паліэтнічнай супольнасцю і яна рассеяна ў часе і прасторы, таму спроба выявіць якія-небудзь стылістычныя, а не сюжэтныя канстанты, уласцівыя яўрэйскаму мастацтву як адзінаму цэламу, загадзя асуджаная на правал. Аднак можна паспрабаваць знайсці нейкія стылістычныя характарыстыкі, якія ўласцівы мастацтву пэўнай яўрэйскай этнічнай супольнасці ў больш-менш кампактным рэгіёне на працягу больш-менш працяглага часу. Вынікі такіх пошукаў будуць упірацца ў тое, наколькі карэктна былі праведзены часовыя і прасторавыя межы» [цыт. па: 1, с. 87-88].

Таксама ў пачатку артыкула аўтар узгадвае, што ў творчасці яўрэйскіх мастакоў можа прысутнічаць розная ступень выяўленасці нацыянальных матэрый і існуюць майстры, для якіх нацыянальная ідэя з'яўляецца значнай, яны робяць акцэнт на сваёй прыналежнасці да яўрэйскага народа (што праяўляецца ў іх творчасці). Для іншага шэрагу мастакоў нацыянальны складнік не з'яўляецца важным датычна як уласнай самаідэнтыфікацыі, так і працы ў сферы мастацтва. У дадзеным выпадку, асноўным з'яўляецца момант асабістай пазіцыі мастака на гэты конт.

Артыкул Бецалеля Наркіса «Што такое яўрэйскае мастацтва?» [2] змяшчае навуковы матэрыял, які тычыцца крыніц прадузятасцяў, звязаных з Другой запаведдзю, прадметаў іудзейскага культу (скрутка Торы, ханукіі) і сімвалаў (меноры, шафара) як аб'ектаў,

аналізуючы якія, можна вывучаць асаблівасці мастацтва яўрэяў. Таксама ў артыкуле гаворыцца аб праявах Бібліі і Мідраша ў творах майстроў.

Б. Наркіс робіць акцэнт на мноствах шляхоў выражэння самасвядомасці яўрэяў, грунтуючыся на канкрэтных прыкладах і дадзеных, у тым ліку, акцэнтуючы ўвагу на сучасным яўрэйскім мастацтве (пасля эмансіпацыі яўрэяў у XIX стагоддзі), дзе гаворыцца аб тым, што абстрактнае мастацтва здольна адлюстроўваць ідэі мастакоў.

Б. Наркіс піша, што пэўны рытуальны прадмет можна аднесці да твораў яўрэйскага мастацтва, калі ён выкарыстоўваўся яўрэямі ў рэлігійных мэтах, нягледзячы на магчымыя запазычанні дэкаратыўных элементаў і формы з іншай культуры, і аўтара – майстра неяўрэйскага паходжання. Што тычыцца яўрэйскага сімвала, то імі, напрыклад, могуць быць лулаў, менора, этрог і інш. (у тым выпадку, калі дадзеныя тыпы сімвалічных вобразаў тлумачацца ў яўрэйскім кантэксце).

У артыкуле Лелі Кантар-Казоўскай «Ці існуе яўрэйскае мастацтва?» [3] пазначана праблематыка існавання мастацтва яўрэяў як асаблівай нацыянальнай мастацкай мовы, змяшчаюцца звесткі аб гістарычным кантэксце, у які ўпісана яўрэйскае мастацтва XIX–XX стст.; звесткі аб мастаках, якія імкнуліся да стварэння спецыфічна новага яўрэйскага мастацтва з апорай на спрадвечна яўрэйскую выяўленчую традыцыю. У дадзеным матэрыяле фігуруе шэраг праблемных кропак і, у адпаведнасці з ім, даследаванні яўрэйскага мастацтва могуць працягвацца, знаходзячы сваё месца ў наступных працах навукоўцаў.

Што тычыцца тыповасці пытання аб яўрэйскім мастацтве, то Л. Кантар-Казоўская піша пра працэс будаўніцтва нацыянальных культур XIX-XX ст. з характэрным для гэтага перыяду «культам мастацкага і ўяўленнем аб яго вядучай ролі ў мастацтве» [цыт. па: 3]. Такім чынам, з аднаго боку, дадзенай тэме была ўласціва рэфлексія, зварот да ўласнай выяўленчай традыцыі, а з другога, творчасць яўрэйскіх мастакоў пачынае развівацца ў бок авангардных напрамкаў. Таксама важным з’яўляецца момант даволі рэзкага развіцця яўрэйскага мастацтва ў XIX-XX ст., звязаны з частымі сумненнямі наконт тэарэтычнай магчымасці яго існавання.

Г. Казоўскі ў артыкуле «Яўрэйскае мастацтва ў Расіі. 1900-1948. Этапы гісторыі» [4] вызначае асноўныя этапы станаўлення прафесійнага яўрэйскага мастацтва, што з’яўляецца значным для абазначанай тэмы. У артыкуле «Штэтл у творчасці яўрэйскіх мастакоў паміж дзвюма сусветнымі войнамі» [5] аўтар гаворыць пра тое, што паколькі яўрэі жылі у мястэчках рысы аседласці, то тэма штэтла шмат у чым сфармавала вытокі яўрэйскага мастацтва XX стагоддзя і ў працах яўрэйскіх мастакоў нярэдка прысутнічаюць успаміны пра жыццё штэтла.

Гаральд Розенберг у артыкуле «Ці існуе яўрэйскае мастацтва?» [6] самым відавочным называе факт, што яўрэйскае мастацтва – гэта мастацтва, створанае яўрэямі. Далей аўтар узгадвае пра больш сур’ёзную канцэпцыю яўрэйскага мастацтва. Яна ўяўляе сабой мастацтва, якое адлюстроўвае яўрэяў ці змяшчае яўрэйскі атрыбут. «Існуе яўрэйскае рамяство і рамесная традыцыя. Гэта менавіта тое, што навукоўцы звычайна прымаюць як яўрэйскае мастацтва» [цыт. па: 6].

Таксама сур’ёзнай тэмай яўрэйскай ідэнтычнасці ў мастацтве даследчык лічыць праблематыку ўспаміна: «У яўрэяў няма манаполіі на гэтую праблему. Але яўрэйскія мастакі адчулі яе асабліва глыбока і непасрэдна. Безумоўна, гэта не яўрэйская праблема; гэта сітуацыя XX стагоддзя, стагоддзя перамешчаных асоб, людзей, якія рухаюцца з аднаго кантэксту ў іншы, і перадаюць памяць» [цыт. па: 6]. Далей мастацтвазнаўца называе мастацкі спосаб асэнсавання рэчаіснасці самым надзейным як для задачы непасрэднага ўспрымання, так і перадачы ўспамінаў у драматычным гістарычным кантэксце стагоддзя.

У кнізе Клер Ле Фоль «Віцебская мастацкая школа (1897-1923)» [7] існуе пункт «Што такое яўрэйскае мастацтва?», дзе аўтар надае ўвагу пытанню, якое тычыцца разнастайнасці яўрэйскага стылю, піша пра статус яўрэйскага мастака ў розныя эпохі. Таксама К. Ле Фоль піша, што існаванне яўрэйскага мастацтва сумненню не падвяргаецца, аднак асаблівасці яго існавання былі звязаны з жыццём яўрэяў на працягу доўгага часу ў кантакце з іншымі культурамі, у асяроддзі іншых абшчын, што ў пэўнай ступені паўплывала на іх уласнае мастацтва.

**Заключэнне.** Разгледзеўшы гістарыяграфію пытання аб яўрэйскім мастацтве і вылучыўшы шэраг асноўных крыніц, мы адзначаем, што, у адпаведнасці з меркаваннем шырокага кола даследчыкаў, адназначнае вызначэнне паняццю «яўрэйскае мастацтва» даць немагчыма. Паленіка на гэтую тэму працягвае прыносіць важныя элемэнты яго разумення. Мы прааналізавалі крыніцы, якія разглядаюць гэтае пытанне з розных ракурсаў (мастацтвазнаўчага, рэлігійнага, філасофскага і г. д.) і прыйшлі да высновы, што тэма даследавання пытання аб яўрэйскім мастацтве застаецца актуальнай.

1. Дымшыц, В.А. Разважанне аб яўрэйскім мастацтве / В.А. Дымшыц // Канон і свабода. Праблемы яўрэйскага пластычнага мастацтва: матэрыялы канф. па пытаннях яўрэйскага пластычнага мастацтва, Масква, жнівень 2001 г. / Яўрэйскае Агенства ў Расіі; рэдкал.: Т. Ваксман, Д. Рубіна, Б. Карафелаў. – Масква, 2001. – С. 85-94.
2. Наркіс, Б. Што такое яўрэйскае мастацтва? / Б. Наркіс // Яўрэйскае мастацтва ў еўрапейскім кантэксце: зб. навук. арт. – Масква, 2002. – С. 11-24.
3. Кантар-Казоўская, Л. Ці існуе яўрэйскае мастацтва? [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: artguide.com. – Дата доступу: 27.01.2023.
4. Казоўскі, Г. Яўрэйскае мастацтва ў Расіі. 1900-1948. Этапы гісторыі / Г. Казоўскі // Савецкае мастацтвазнаўства: зб. навук. арт. – Масква, 1991. – С. 228-254.
5. Казоўскі, Г. Штэтл ў творчасці яўрэйскіх мастакоў паміж дзвюма сусветнымі войнамі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: ju.org.ua. – Дата доступу: 27.06.2023.
6. Рознберг, Г. Ці існуе яўрэйскае мастацтва? [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: artguide.com. – Дата доступу: 28.02.2023.
7. Фоль Ле, К. Віцебская мастацкая школа (1897-1923) / К. Ле Фоль. – Мінск: Прапілеі, 2007. – 240 с.

## СПЕЦИФИКА ВЗАИМОДЕЙСТВИЯ АКТЕРА В СЦЕНИЧЕСКОМ ПРОСТРАНСТВЕ КУКОЛЬНОЙ ПОСТАНОВКИ

***Горолевич Т.В.,***
*аспирант ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*
*Научный руководитель –* ***Цыбульский М.Л.,*** *канд. искусствоведения, доцент*

Ключевые слова. Актер, спектакль, кукла, пластика, взаимодействие, специфика, театр кукол, особенности.
Key words. Actor, performance, doll, plastic, interaction, specifics, puppet theater, features.

В кукольном театре деятельность актера в сценическом действии постановки имеет свои особенности. Организуя пространство спектакля, выстраивая визуальную его форму, художник предопределяет динамику этого пространства. Актер в сценографическом пространстве всегда взаимосвязан и взаимозависим с другими компонентами представления.

Цель: анализ особенностей взаимодействия актера в сценическом пространстве спектакля.

**Материал и методы.** Материалом послужили литературные источники по теме исследования. Использован метод сравнительного анализа и общенаучные методы – описания, обобщения и наблюдения.

**Результаты и их обсуждение.** Искусство театра кукол немыслимо без двух основополагающих компонентов – кукла и актер. В конце XX века появление «живого плана» или актера в маске, относили к дополнительным средствам, они применялись в незначительной, второстепенной мере. Сейчас все чаще драматическая игра актера выступает наравне с основным средством (куклой). Иногда кукла является лишь незначительным элементом спектакля. В кукольном театре на сцене актер попадает в вымышленный, рожденный фантазией художника и режиссера мир. Поэтому главной задачей сценографа является – «создать условия» и эстетическую среду для актеров-исполнителей. Режиссер и театровед М. Королев в своей книге «Искусство театра кукол», так описывает специфику деятельности актёра на кукольной сцене: «Сценическое действие – основной признак театра вообще. Именно через действие создаётся сценический образ – результат сценического творчества. Наиболее универсальным средством всех видов театра – искусства зрительного, визуального – является физическая деятельность актера на сцене. С физической глубоко связана духовная, психическая деятельность актера в процессе сценического действия. И в каждом